# ПАМЯЦЬ І ПРАЎДА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

**Вашкевіч М.Д.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – канд. філал. наук, доц. Ляскевіч С.Г.

**Актуальнасць.** Вялікая Айчынная вайна – адзін з самых страшных жахаў, праз якія прайшла Беларусь у дваццатым стагоддзі. Гэта – незагойная рана, боль і кроў беларускага народа, спаленыя вёскі і дзіцячыя слёзы. Памяць аб гэтай трагедыі захоўваецца ў сэрцы кожнага беларуса. Паэты і пісьменнікі, якія прайшлі праз вайну, былі абпаленыя вайной, ніколі не дазволяць нам забыць тое, што выпала на долю беларускага народу падчас Вялікай Айчыннай вайны.

**Мэта.** У межах дадзенага артыкула мы хочам нагадаць тых аўтараў і тыя празаічныя творы, дзе пра вайну пішуць непасрэдныя яе сведкі. Безумоўна, цяжка ўявіць, колькі думак, эмоцый і перажыванняў, душэўных сіл уклалі пісьменнікі, каб у мастацкай форме перадаць суровую рэальнасць ваенных дзён, аднак і выхаваўчы патэнцыял гэтых твораў найвышэйшага ўзроўню, як і сіла ўздеяння на чытача.

**Метады даследавання.** Аб’ектам даследавання сталі творы Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Васіля Быкава і Кузьмы Чорнага. Для спасціжэння ідэйна-мастацкага зместу твора, творчай індывідуальнасці пісьменніка варта абапірацца на біяграфічны метад, метад культурна-гістарычнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сярод твораў, прысвечаных ваеннай тэме, аповесці і раманы Васіля Быкава паказваюць супярэчны характар вайны, якая ў яго не чорна-белая; вайна праяўляе сапраўдныя твары людзей і ставіць асобу перад цяжкім выбарам паміж жыццём і сумленнем, прымушае праходзіць праз цяжкія выпрабаванні, якія становяцца праверкай ідэалаў герояў. Асабліва яркім прыкладам падобных маральных дылем можна назваць аповесць «Жураўліны крык» і персанажаў Свіста і Пшанічнага, дзе першы – марадзёр, які скраў шмат сала ў іншага салдата, а другі – дэзертыр, пакінуўшы сваіх саслужыўцаў напярэдадні бою. Васіль Быкаў, які і сам удзельнічаў у баявых дзеяннях, хацеў паказаць вайну такой, якая яна ёсць, яе сапраўдны выгляд, які нярэдка губляецца за велічнымі лозунгамі і патрыятычнай вокладкай. Акрамя гэтага, ён таксама імкнуўся паказаць боль і жах, у якім апынуліся звычайныя жыхары Беларусі, якім прыйшлося жыць на акупаванай зямлі. Гэта вельмі ярка адлюстравана ў мностве яго твораў, такіх як «Незагойная рана», «Знак бяды» і інш. Значнай асобай сярод аўтараў, якія пісалі пра вайну, з’яўляецца Алесь Адамовіч.



Рэпазіторый ГрГМУ

Ужо ў шаснаццаць год ён трапіў у партызанскі атрад і сам прайшоў праз полымя вайны. Жадаючы апісаць зверствы і жорсткасць акупантаў, Алесь Адамовіч напісаў мноства твораў, у тым ліку «Хатыньскую аповесць», якая распавядала пра жыццё маладога партызана, што на ўласныя вочы ўбачыў карную аперацыю фашыстаў над мірным насельніцтвам вёскі. Ідэя гэтай аповесці ў будучым лягла ў аснову сцэнарыя фільма Элема Клімава «Ідзі і глядзі» (рус. «Иди и смотри»), які быў прызнаны мноствам аўтарытэтных выданняў і крытыкаў як адзін з самых дакладных і страшных фільмаў пра вайну. Акрамя гэтага, Алесь Адамовіч разам з Янкам Брылём і Уладзімірам Калеснікам у 1975 годзе выдаў кнігу «Я з вогненнай вёскі...», якая з'яўляецца зборнікам успамінаў людзей, што прайшлі праз вайну. За тры гады аўтары аб'ездзілі 147 беларускіх вёсак і запісалі на дыктафон больш за трыста гісторый тых, хто цудам ацалеў у вогненных вёсках, каго аўтары называюць «Сведкамі Праўды». Сваю задачу складальнікі бачылі ў тым, каб «зберагчы, утрымаць, як плазму, невыносную тэмпературу чалавечага болю, недаўмення, гневу, якія не толькі ў словах, але і ў голасе, у вачах, на твары» [1, с. 6] з той мэтай, каб не даць абяліць у вачах новых пакаленняў «гэтую чуму XX стагоддзя»-фашызм, каб успаміны простых беларусаў былі той Вялікай Праўдай, заслонай, якая стане на шляху тых, што фактычна пасля Нюрнберга пачаў надаваць «чалавечыя рысы нацызму, падмяняючы памяць народаў рэваншысцкай тугой генералаў, настальгіяй былых халуёў фюрэра» [1, с. 5]. Гэта быў аповяд праз слёзы, бо нават чытаць гэтыя ўспаміны немагчыма, – а людзям выпала перажыць усе тыя жахі, і, расказаўшы, прайсці праз трагедыю нанова. Тут аповяд маці, на вачах якой забіваюць дзіця, тут успаміны пра кінутыя ў агонь дзіцячыя цельцы. Аднак пэўная частка расказанага была настолькі жудаснай, што была закрыта цэнзурай да друку. Сам Янка Брыль, адзін з аўтараў кнігі, таксама актыўна падымаў тэму вайны ў сваёй творчасці. Яго, напэўна, галоўны твор, раман «Птушкі і гнёзды» з'яўляецца ўнікальным антываенным выказваннем, гісторыяй аднаго чалавека, прайшоўшага праз канцлагер. Праз увесь раман цягнецца ідэя нацыянальнай свабоды, думка аб тым, што чалавек застаецца чалавекам незалежна ад радзімы, і што галоўныя каштоўнасці, якія мы мусім захоўваць – гуманізм і свабода, нацыянальная ідэнтычнасць, якую неабходна берагчы, нягледзячы на прыгнёт і даўленне з боку іншых краін. Не меньш унікальны погляд на беларусаў падчас Вялікай Айчыннай вайны прапаноўвае і Кузьма Чорны ў сваім рамане «Пошукі будучыні». Яго персанажы захоплены ідэяй пошуку ціхага жыцця і шчасця, пакуль свет вакол іх рушыцца. Раман падымае праблемы некалькіх пакаленняў і таго, як вайна знішчае жыцці, адымае ў людзей дом, сем'і і дзяцінства. Нягледзячы на гэта, Кузьма Чорны пакідае ў чытача надзею, што беларускі народ перажыве гэтыя цяжкасці і зноў расквітнее. Аўтар параўноўвае Беларусь з таполей, якая, нягледзяцы на ўсе спробы яе знішчыць, усё роўна жыве і дае насенне, гэтым самым прадракаючы краіне мірнае і квітнеючае будучае.



Репозиторий ГрГМУ

**Вывады.** Такім чынам, мастацкія і дакументальныя творы беларускіх пісьменнікаў захоўваюць памяць і перадаюць новым пакаленням праўду пра Вялікую Айчынную вайну, дапамагаюць усвядоміць напал трагедыі і боль невыносных выпрабавнняў, праз якія прыйшлося прайсці нашаму народу.

**Спіс літаратуры**

1. Адамовіч, А. Я з вогненнай вёскі… / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – 439 с.

## ПРОБЛЕМА ТЕРМИЧЕСКОЙ ТРАВМЫ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

**Глебович А.В., Романюк Ю.В.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Республика Беларусь

Научный руководитель – подполковник м/с Окулич С.И.

**Актуальность.** Перед Второй мировой войной ни СССР, ни его союзники или противники не имели в штатах военного или гражданского здравоохранения специализированных лечебных учреждений для пострадавших с термической травмой. Несмотря на это, в Советском Союзе активно изучались вопросы патогенеза и хирургического лечения ожогов на всесоюзных съездах хирургов. Актуальность проблемы резко возросла с началом Великой Отечественной войны в связи с совершенствованием боевой техники и поражающего оружия.

**Цель.** Провести исторический анализ изучения термической травмы в годы Великой Отечественной войны и оценить развитие системы оказания помощи пострадавшим в послевоенный период.

**Методы исследования.** Проведён историко-медицинский анализ научных публикаций, посвящённых изучению термической травмы и организации помощи обожжённым в годы Великой Отечественной войны, а также обзор архивных данных о структуре санитарных потерь и методах лечения ожогов в военно-полевых условиях.

**Результаты и их обсуждение.** Термическая (ожоговая) рана (травма) – это открытое повреждение или деструкция кожи, ее придатков или слизистых оболочек [1].

В годы Второй мировой войны белый фосфор стал одним из новых средств химической агрессии. Применяемый в зажигательных боеприпасах, он вызывал не только тяжёлые ожоги, но и системное отравление организма. Наиболее цинично фосфор использовался в нацистских концлагерях:

Репозиторий ГрГМУ